**Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя ўласнага імя»**

| | |
|---|---|
| Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы | Адукацыйная праграма магістратуры (паглыбленая вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 7-06-0232-01 Мовазнаўства<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: кампанент установы вышэйшай адукацыі * |
| **Кароткі змест** | Паняцце анамастыкі, яе аб'ект і задачы даследавання. Месца анамастыкі сярод іншых дысцыплін. Функцыі онімаў. Раздзелы анамастыкі. Асноўныя паняцці анамастычнай навукі, сутнасць базавых анамастычных тэрмінаў. Класіфікацыі онімаў, яе асновы і віды онімаў. Асноўныя напрамкі даследаванняў у вобласці анамастыкі. Спецыфіка этнакультурнай інфармацыі, закладзенай у тапанімічным матэрыяле. Антрапанімія як моўная крыніца інфармацыі аб духоўнай культуры народа. Праблемы перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі. Асноўныя этапы і працэсы ў гісторыі беларускай антрапаніміі. Шляхі фарміравання сучаснага іменаслову беларусаў. Тапаніміка як навука пра ўласныя найменні геаграфічных аб'ектаў. Віды класіфікацый тапонімаў. Разнавіднасці тапанімічных найменняў. З гісторыі вывучэння беларускай тапаніміі. Лексіка-семантычная характарыстыка і структура тапаніміі Гомельшчыны. Анамастыка мастацкага тэксту. Спосабы рэпрэзентацыі нацыянальна-культурнай семантыкі онімаў. Анамастычная лексікаграфія. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць***: асноўныя палажэнні сучаснай тэорыі ўласнага імя; разнастайныя анамастычныя тэрміны і паняцці; выдатных даследчыкаў беларускіх уласных імёнаў і іх асноўныя навуковыя працы; галоўныя навуковыя праблемы сучаснай беларускай анамастыкі і перспектыўныя шляхі яе развіцця; найбольш эфектыўныя і перспектыўныя метады і прыёмы аналізу анамастычнага матэрыялу; навуковую і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі; ***умець:*** адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты; праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады; заўважаць агульнае і адметнае ў навуковых фактах розных анамастычных разрадаў лексікі; карыстацца разнастайнымі анамастычнымі слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і даведачнай літаратурай; выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы. ***валодаць:*** сістэмай навуковых паняццяў беларускай анамастыкі; метадамі анамастычных даследаванняў і методыкай збіральніцкай працы; методыкай выкладання беларускай анамастыкі ў школе; навыкамі арганізацыі навуковай анамастычнай працы вучняў і кіравання анамастычным гуртком. |
| **Прэрэквізіты** | Кагнітыўная этналінгвістыка. Сацыяльная лінгватыпалогія. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 90 акадэмічных гадзін, з іх 34 аўдыторных: 22 г лекцый і 12 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3-і семестр, экзамен. |